Наш культурны асяродак
Жыраандоля
Выпуск № 22 (239)

■ Даследуем праблему

«МУЗЕЙНАЕ» ЛЕТА: ЧАМУ ЗАЛЫ ПУСТЫЯ?

Музей — менавіта тое месца, дзе ты можаш дакрануцца да культуры. Перад табой — палотны, скульптуры амаль што ў поўны рост і ты з імі сам-насам. Ты стаіш перад імі, глядзіш і не можаш паварушыцца ад усведамлення дасканаласці. Такое пачуццё, напрыклад, выклікалі ў мяне велічныя скульптуры Мікеланджэла, якія можна пабачыць у Луўры...

Людзі, якія летам выязджаюць за мяжу, пагодзяцца са мной: у музеях аншлаг! Доўгія чэргі наведвальнікаў, сярод якіх і турысты, і мясцовыя жыхары. Можна некалькі гадзін прастаяць, але ж трапіць у музей. Людзі ведаюць, што іх чакае нешта адметнае і цікавае. Такія чэргі наведвальнікаў мне давялося бачыць у Барселоне (людзі марылі трапіць у музей Пабла Пікаса) і ў Парыжы — у славуты Луўр. У нашай краіне як толькі надыходзіць лета, у музеях пусцеюць залы.

Але ж адна справа — там, іншая — тут. Адно — Луўр, іншае — беларускі музей. Звычайна мы так разважаем. Але ці слушна? Бо летам, калі культурнае жыццё з тэатральных, канцэртных залаў сыходзіць (з-за адпачынку), самы час для музеяў, якія працягваюць працаваць. Здавалася б...

Але чаму ў нас так адбываецца, што музеі, нават калі няма аніякай канкурэнцыі, не надта абцяжараны наведвальнікамі?

Мы вырашылі пашукаць адказы на гэтае пытанне. І найперш — у саміх музеях.

Дзіяна ШАНТОР — загадчыца аддзела навукова-асветніцкай працы Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі:

— Лета — тая пара года, калі людзі плануюць свой адпачынак і выязджаюць за мяжу. Што б мы ні рабілі, летам наведвальнікаў не можа стаць больш. Яшчэ адна праблема, якая таксама аказвае ўплыў — невялікая колькасць турыстаў. Ім цікавей Брэсцкая крэпасць, розныя замкі, агратурызм, і толькі потым — музеі. Часцей за ўсё да нас прыязджаюць з Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы — нашы суседзі. Тым часам у Еўропе 60% наведвальнікаў музеяў — менавіта турысты, прычым на працягу ўсяго года. А ў нашай краіне вялікую колькасць наведвальнікаў складаюць школьнікі і студэнты. Летам у іх канікулы. Да нас прыходзяць у выхадныя дні дзеці са сваімі бацькамі, але ж іх таксама не вельмі шмат. Адзіны дзень, калі ў мастацкім музеі Беларусі шмат народу — апошняя серада кожнага месяца, калі ўваход вольны. Летам мы працягваем працаваць у тым жа рэжыме, што і на працягу года, перыядычна мяняем экспазіцыю, разумеем: зараз не будзе шмат наведвальнікаў, таму самае цікавае пакідаем на восень. Але ж таксама стараемся прыдумаць нешта неардынарнае. Напрыклад зараз мы паспрабуем ажывіць наш дворык, які знаходзіцца побач з летняй кавярняй, зробім выставу на траве. Заадно апраўдаем назву «арт-дворык».

Напэўна, у нашай цікавасці да айчынных музеяў адыгрывае сваю ролю выхаванне ў сям'і, калі не прывіваецца разуменне таго, што адпачываць можна і прыемна, і карысна, адкрываючы для сябе нешта. Але... У нас мала сонца на працягу года, таму мы ляцім у цёплыя краіны, да мора, ці выязджаем на родную прыроду. І не памятаем, што некаторыя нашы музеі, напрыклад, літаратурныя Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, кожнае лета праводзяць святы на прыродзе. Музей Купалы — свята паэзіі, песні і народных рамёстваў у Вязынцы, дзе целы дзень гучаць песні і вершы на беларускай мове, прадаюцца кашулі-вышыванкі, саламяныя лялькі. Музей Багдановіча збірае ў фальварку Ракуцёўшчына,

У нашай цікавасці да айчынных музеяў адыгрывае сваю ролю выхаванне ў сям'і.

што недалёка ад Маладзечна. Дык, можа, проста трэба паспрабаваць адзін раз з'ездзіць на адно з такіх святаў са сваімі дзецьмі, каб яны ўбачылі ўсё на свае вочы і атрымалі тое самае разуменне адпачынку праз культуру?

Анжаліка ПЕШКУР — супрацоўніца літаратурнага музея Янкі Купалы:

— Ведаеце, на працягу года наш музей наведвае шмат людзей, а летам іх колькасць змяншаецца. Але ж летам мы працуем гэтаксама, як і на працягу ўсяго года. Кожны з нашых філіялаў музея жыве сваім асабістым жыццём. Напрыклад у Вязынцы, падчас правядзення штогадовага свята паэзіі, песні і народных рамёстваў, якое адбываецца 6 ліпеня, збіраецца шмат гасцей. Абумоўлена гэта вялікай колькасцю рэкламы і блізкасцю Вязынкі да Мінска. Таксама шмат людзей наведваецца ў філіял, які знаходзіцца ў Ляўках (Віцебская вобласць). У той час у галоўным музеі колькасць экскурсій значна змяншаецца. Магу патлумачыць гэта толькі адным фактарам — у нашай краіне не сфарміраваная культура паходаў у музеі. Бацькі сваім дзецям не прывіваюць любоў да культуры з маленства. Пагадзіцеся, калі маці падабаецца наведваць тэатры, музеі і разнастайныя выставы, то і яе дзіця таксама будзе гэтым цікавіцца! У нас няма практыкі кожныя выхадныя наведвацца ўсёй сям'ёй у музей, як, напрыклад, гэта робяць у Еўропе.

Яшчэ адна з прычын, і зусім не апошняя, — адсутнасць інфраструктуры. Азірніцеся наогул — усё змяняецца. Усё змяняецца на карысць чалавеку. А ў шмат якіх нават значных нашых музеях няма ўтульных кавярняў. Пагадзіцеся, пасля прагляду экспазіцыі, якая можа быць размешчана аж на трох паверхах, вельмі хочацца зайсці ў кавярню і крыху адпачыць. Напрыклад, летась я выпадкова зайшла ў музей прыродазнаўчых навук CosmoCaixa, які знаходзіцца ў Барселоне. Там, акрамя кавярні, была прадугледжана пляцоўка для пікніка...

Турысты ці нават свае людзі, якія выбраліся ў музей, хацелі б панесці з сабой на памяць нешта адметнае, цікавае, крэатыўнае, няхай і маленькае. Кнігі, магніты, кубкі — выдатна, што гэта з'яўляецца пакрысе. Але, напрыклад, у Луўры можна набыць каляндар на сцяну, розныя наклейкі, закладкі для кніг, блакноты — тое, чым можна карыстацца, з прыемнасцю ўзгадваючы праведзены час.

Алег РЫЖКОЎ — дырэктар Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі:

— Сапраўды, колькасць людзей і экскурсій летам значна змяншаецца. Але ж у выхадныя дні могуць прыехаць турысты. Часцей за ўсё — з Расіі. Што тычыцца нашых людзей, то яны прыходзяць на тыдні. Магу гэта растлумачыць толькі тым, што ў выхадныя дні людзі выбіраюць не музеі, а адпачынак на прыродзе. Каб людзі зноў пачалі цікавіцца і прыходзіць у музеі, неабходна, на мой погляд, змяняць пастаянныя экспазіцыі, праводзіць унутры іх розныя цікавыя мерапрыемствы, як гэта робяць, напрыклад, на Захадзе. Яшчэ адзін момант: пагадзіцеся, дзяцей са школьных гадоў вядуць у музеі. Гэта становіцца абавязковым, але ж не па жаданні. Каб у музеі пачалі хадзіць сем'ямі, трэба стварыць інфраструктуру, якая б уключала ў сябе цікавыя мерапрыемствы, сустрэчы з мастакамі і скульптарамі, музейны шопінг, камфортную кавярню. Калі мы дойдзем да такіх комплексаў, то пачнём збіраць шмат наведвальнікаў.

Беларускія музеі несправядліва застаюцца ў цені. У іх ёсць што паглядзець на працягу года і ўлетку. Бясспрэчна, нашым музеям патрэбна развіццё інфраструктуры і больш адмысловасці, крэатыву. Магчыма, калі перад наведвальнікамі пачнуць раптоўна ажываць скульптуры не толькі ў «Ноч музеяў», альбо інтэрактыўныя інсталяцыі стануць іх часткай, тады і інтарэс не прымусіць сябе чакаць. Але ж у нашых айчынных умовах паказальны адзін момант: у апошнюю сераду кожнага месяца (калі вольны ўваход) Нацыянальны мастацкі музей збірае шмат наведвальнікаў! Няўжо справа толькі ў грошах? Але ж няўжо нас надта ўратуе пяцьдзясят тысяч за дарослага, каб трапіць у мастацкі музей, трыццаць — у гістарычны? Пры тым, што гэта, можа, раз на год, а то і радзей, і прадугледжана гнуткая сістэма аплаты?.. Можа быць, справа яшчэ і ў людзях, якія часта не разумеюць, што музей існуе не толькі дзеля забавы, што ён зберагае тое каштоўнае, што ёсць у культуры і мастацтве. Каштоўнасць — ад слова «кошт». Але яна можа быць і бясцэннай. Толькі як у гэтым упэўнішся, не трапіўшы ў музей?

Іна КОРСАК.

■ Асоба

Галіна ХУДНІЦКАЯ: «ІМКНУСЯ, КАБ РОСПІС ПА ТКАНІНЕ «ДЫХАЎ»

Яна ўмее маляваць паэзію. Не, не маляваць, а хутчэй перадаваць адчуванне — тонкімі лініямі, рытмамі, зашыфраванымі ў колерах, узорах-пачуццях. Пачуццёвасць — наогул адметная рыса мастачкі Галіны Худніцкай. А я вось думаю: ці можа быць інакш, калі чалавек працуе з вельмі тонкімі, амаль празрыстымі матэрыяламі, ды яшчэ гэтую празрыстасць падкрэслівае, наносячы малюнак сваёй рукой? І вось тут зразумееш, чаму выставу полацкай мастачкі Галіны Худніцкай у бібліятэцы Пушкіна захацелі бачыць усё лета: яна пра паэзію (таго ж Пушкіна!), і яна вельмі паэтычная. Лёгкая пастэль паказвае сядзібы, якія натхнялі паэта і працягваюць натхняць — і паэтаў, і мастакоў. Радкі вершаў самі сабой прыходзяць у галаву, вобразы ўсплываюць з памяці і дадаюць маштабу, удакладняючы тое, што бачыш. Але калі бачыў не толькі гэтую, але і іншыя выставы Галіны Худніцкай, то дадаеш, накладваеш яшчэ і адчуванне яе паэзіі, заключанай у цудоўных творах роспісу па шоўку, у якіх яна асабліва любіць самавыяўляцца. Яна скончыла мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага інстытута імя Кірава, неаднаразова ўдзельнічала ў рэгіянальных, рэспубліканскіх, міжнародных выставах і пленэрах, мае больш за 10 персанальных выставак у Беларусі і за мяжой. І гэта той выпадак, калі, агледзеўшы яшчэ адну выставу, захацелася паразмаўляць не толькі пра канкрэтную ідэю, але наогул пра дзівоснае майстэрства батыку, працы ў якім бачыла раней у выкананні мастачкі.

— Мастак не выбірае тэму — я ў гэтым упэўнена, — гаворыць Галіна. — Тэма выбірае яго — і тады ўсё складваецца. Мы шмат пра што ведаем, шмат дзе бываем, колькі крыніц ведаў ёсць, а таксама і спосабаў выказаць пачуцці ў вобразах. Але трэба, каб усё так спалучылася, што ты захацеў гэтым займацца. Я не думаю, што ў жыцці нешта бывае выпадкова. Кожная выстава — невыпадковая. Кожная серыя. Так склалася, што я стала ўдзельніцай пушкінскіх пленэраў, разам з якім мы праехалі па яго сядзібах — і адбылося зліццё паэзіі з краявідамі. Я адразу ўбачыла самую зямлю — яна ў чырвоным адзенні. Тое, чаго ў нашай зямлі не бачу, але ж гэта паўночная зямля. Рэльеф, віды, рытмы — вось крыніцы, якія натхнілі. І мая любоў да восені, бо я нарадзілася ў гэтую пару. Падчас першага пленэру я свае адчуванні выкладала ў сваім улюбёным батыку — расіяне вельмі здзівіліся, як гэта атрымліваецца роспіс. Эмоцый было шмат, а батык ствараецца доўга. Таму падключылася пастэль — хацелася адлюстраваць як мага больш. І з'явілася серыя «Прырода. Паэзія. Пушкін». Мая любімая вэлюмная пастэль падышла сюды. Адчуваеш часам, што батык ужо не справіцца адзін, калі з цябе льюцца эмоцыі. Хоць ёсць ідэі перавесці некаторыя з пастэляў у батык.

— Вы сказалі, што зямля не такая, як у нас. А ці ёсць задумы беларускіх серый?

— Ёсць такія задумы. Нельга думаць, што чалавек увесь час знаходзіцца ў адным стане, у адной тэме. І нават у адным матэрыяле.

— Але ж у вас дакладна адчуваецца прыхільнасць да пэўнага матэрыялу...

— Чаму я выбрала тэхніку батыку? У інстытуце мы працавалі ў розных тэхніках і матэрыялах. Мастацка-графічны факультэт не падзяляў дэкаратыўны і жывапісны напрамак, калі я вучылася. Але менавіта калі пачаўся роспіс па тканіне, я зразумела, што магу спалучаць розныя тэхнікі. У батыку спалучаюцца і графіка (калі контуры выкарыстоўваеш), і пастэль (няяркасць, паўтоны на тканіне, калі слаі кладуцца няшчыльна і перацякаюць адзін у другі), акварэль, вітраж (калі цалкам замкнёным контурам робіцца малюнак)... Калі ўсё гэта спалучыць, то атрымаецца мой батык. Я стала працаваць і зразумела: для мяне гэта якраз тая доля складанасці, свабоды, эксперыменту, творчасці, што дазваляе ўкласці рознае адчуванне нейкіх з'яў.

Яшчэ з інстытуцкай пары я выбрала батык, і трэба прызнаць, што тады даволі складана прыйшлося: фарбавальнікаў не было, я іх рабіла з іншых матэрыялаў — трэба прызнаць, што гэта была цікавая задача. Цяпер, калі гэтыя фарбавальнікі ёсць, я лаўлю сябе на тым, што не выкарыстоўваю іх у такой колькасці. Але я не перайшла ў іншыя тэхнікі, таму што мы знайшлі адно аднаго.

У мяне выпрацавалася асаблівая аўтарская тэхніка — пейзажны роспіс па тканіне. Я вельмі люблю акварэль, але я вельмі люблю тканіну. Як гэта спалучылася? Напэўна, у творчым пошуку. Таму што ў мяне ўвесь час ідзе эксперымент, можа, таму я так доўга жыву ў гэтай тэхніцы. У мяне амаль няма раздзяляльных ліній. Фарбавальнікаў у мяне шмат розных — павярхоўных, шчыльных. Я навучылася іх адчуваць і спалучаць. Я ведаю, які колер атрымаецца, і нават шчыльнасць. І яшчэ цікавы момант падсыхання (калі па сырым пішаш): гэта момант, калі можаш дадаваць наступны слой. Пейзаж па тканіне вельмі складаны: спляценні фарбаў, яны ствараюць слаі, можа атрымацца то святлей, то цямней. Часам нават для мяне непрадказальна. Таму кожны раз перажываю стан нейкага творчага скачка. І гэта радуе, хоць яно стамляе, турбуе, хвалюе. Як вершы пішуцца — гэта ж кожны раз фантан эмоцый. Ты ўжо не на тэхніку спадзяешся, а на свае пачуцці, на тое, што ўнутры саспела — ідэю, настрой.

— Тканіна — складаны матэрыял?

— Так, асабліва пейзажы я пішу не на натуральных шаўках. Натуральны шоўк вельмі дарагі, але, як ні дзіўна, ён мне не падабаецца для пейзажаў: надта багаты сам па сабе, дае бляск, які забівае малюнак. Я шукаю розныя матэрыялы: можа быць, атлас ці шоўк, толькі тонкі. Але тонкі шоўк у нас не распіваюць: на ім складана зрабіць малюнак. А мне вельмі гэта цікава, асабліва калі змешваюцца колеры, яны нават могуць узмацняцца: напрыклад, чырвоны становіцца рубінавым, амаль бардовым. На тонкім шоўку цудоўна атрымліваецца абстрактны жывапіс, яго можна аформіць як твор, узяўшы на раму. Але я абстрактныя малюнкі ўспрымаю толькі на дэкаратыўных вырабах — шаліках, хустачках.

Калі шчыра, то я чалавек прыроды, з прыродай вырасла на Гомельшчыне, дзе навокал былі лясы. Шмат ад бабулі ўзяла сакрэтаў, рэцэптаў, як у лесе выжываць, якія травы для чаго прымяняць. Гэта было цудоўна, калі я адкрывала для сябе лес. І гэтую «прыроднасць» я не магу прамяняць на сімвалічнасць. Я заўважыла, што гэта прыходзіць з узростам ці з часам, калі раптам узнікае чалавек-сімвал. Сімвалічнае, як нейкая знакавая сістэма, выяўляецца ў мяне ў шаліках і хустачках, якія ствараю на тонкім шоўку. Але пакуль я чалавек-прырода. Імкнуся, каб роспіс па тканіне ў мяне «дыхаў». Хочацца данесці да гледача ў батыку пейзажы, калі амаль у празрыстых, ледзь улоўных слаях фарбы ён можа адчуваць дух прыроды. Таму я батык выбрала. Папера — больш трывіяльны матэрыял, да якога мы прывыклі, не ставімся да яе як да дарагога каштоўнага матэрыялу. А тканіна яшчэ застаецца загадкай. І пры гэтым яна яшчэ нясе прыгажосць праз малюнак...

Для мяне камертон творчасці — музыка, якая гучыць у галаве, калі твор скончаны. Чую ледзь улоўную музыку — і гэта значыць, што праца атрымалася, яна ажыла.

— Тканіна — непрадказальны матэрыял. Яшчэ і працуеце без рэзерву (лінія з воску ці інш., якая аддзяляе фарбы. — Аўт.). Ці бывае здзіўленне: задумвалася адно, але атрымалася іншае?

— Бывае, атрымліваецца нават лепш менавіта таму, што матэрыял дапамагае. Калі ты яму ў нечым аддаешся, ідзеш за ім.

Лаўка Анегіна.

Яшчэ добры плюс — практыка. Калі 15-гадовы вопыт працы, то ты яго маеш ужо недзе на кончыках пальцаў. А матэрыял падхоплівае, таму што ўжо ёсць з ім кантакт. Першапачаткова такога было шмат, калі не атрымлівалася, як у галаве. Але я навучылася, каб ідэі даспявалі ў галаве раней, чым яны гатовыя выйсці вонкі. Як жанчына нараджае дзіця: яна не павінна нарадзіць раней, чым яно саспее.

Мы развіваемся, вучымся, набываем вопыт. Ідзём па пэўным шляху. І гэта нармальна, калі шмат з таго, што ты рабіў, было зроблена менавіта так, а не інакш. Але важна, што ты па-ранейшаму гэта любіш і вяртаешся ў той стан, калі ты можаш здзіўляцца самой творчасці. Калі шчыра, з любоўю, адкрыта працуеш, калі табе ёсць што сказаць нават праз 20 гадоў працы. Блаславёны шлях мастака, калі няўдачы ці творчыя памылкі не прымушаюць пакутаваць і ўпадаць у дэпрэсію, а з'яўляюцца рухавіком.

Я ў гэтым сэнсе шчаслівы чалавек, таму што не баюся памылак. Я нацэлена на гледача. Упэўнілася за шмат гадоў, што няма гледача, не падрыхтаванага да ўспрымання мастацтва. Бываюць людзі, якія, здаецца, адчуваюць, што я ўклала ў працу. Гэта і ёсць мая задача — каб чалавек на імгненне забыў пра побыт і спрычыніўся да сутворчасці праз маю працу. Бо наша творчасць заўсёды мае пасыл: найперш для таго, каб чалавек развіваўся.

— Батык цяпер — даволі папулярны занятак, яго можа асвоіць любы чалавек. Чым аматарскія заняткі батыкам адрозніваюцца ад прафесійнай творчасці, на вашу думку?

— Адзін чалавек сказаў: той, хто ўмее маляваць, становіцца мастаком тады, калі яму ёсць што сказаць іншым. І калі ён ведае і ўмее, як гэта паказаць. Найперш: ён хоча сказаць. Ён здольны бачыць свет, хоча быць да яго датычным. Мы ведаем шмат прыкладаў, калі чалавек нідзе не вучыўся, але ён творца. А бывае і наадварот. Калі ёсць клуб па інтарэсах, там ствараюць прыгожыя карцінкі, яны таксама маюць права быць — у доме, іх можна падарыць сябру. Але ў твораў мастацтва ёсць адметнасць: яны выклікаюць на дыялог, правакуюць пачуцці. Таму нават у пляме на сцяне (як даводзіцца чуць) можна ўбачыць пэўны згустак эмоцый. Той чалавек, які здольны гэта ўбачыць — мастак, нават калі ён сам не малюе.

Сёння батык — моднае хобі. Гэта элемент навыку, бо чалавеку падабаецца спасціжэнне новага. Гэта элемент колератэрапіі. Насамрэч любы від творчасці спрыяе суназіранню, дапамагае спыніцца ў мітусні. І яшчэ гэта зносіны — бо ў наш час (калі жыццё вельмі імклівае) людзі пакутуюць ад адзіноты і шукаюць кантактаў з іншымі.

Ёсць інтарэс да батыку, мода, але яна праходзіць. А розніца ў тым, што калі ты выбіраеш матэрыял, а ён цябе, то ты праз яго не проста самавыяўляешся, а яшчэ нясеш у свет пэўны пасыл, энергетыку, гармонію. І гэта не праходзіць. Чалавек кантактуе з гэтай карцінай. Яна жыве ў сям'і. А мастак — гэта носьбіт ведаў, якія праз сімвалы перадае людзям. За кожным творам стаіць свая гісторыя. Калі ўкладваеш інфармацыю, то ўкладваеш ва ўсё — ці то дэкаратыўна-прыкладная праца, ці то ўтылітарная рэч, дзеля ўпрыгожвання. Як, напрыклад, матылёк на хустачцы. Тонкі, ледзь улоўны, з крыламі. І, можа, чалавек паглядзіць і падумае: у кожнага свае крылы, кожны сам выбірае, ці ўзлятаць яму...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Сакура.

■ Рэальная кінаманія

ЦІ ТРЭБА ДАВЯРАЦЬ ГЛЯДАЦКІМ КАМЕНТАРАМ ПРА ФІЛЬМЫ?

Час ад часу сустракаюцца людзі, якія называюць сябе кінаманамі. Ёсць кінаманы, а ёсць тыя, хто лічыць сябе такімі. Ганарлівая назва прадугледжвае грунтоўную глебу, але ці заўсёды за словам нешта ёсць?

Хлопец з імем на французскі манер, які не чытае кніг, але чытае Playboy і MAXIM, з упэўненасцю, што зробіць гэтым моцнае ўражанне, сказаў:

— Я, дарэчы, заўзяты кінаман.

— Праўда? — ажывілася я. — Якіх рэжысёраў ты любіш?

— Я люблю Таранціна, ведаеш такога? — ён думае, я з іншай планеты.

— Выдатны рэжысёр, — адказала я. — Яшчэ каго-небудзь?

— Ну... Яшчэ ёсць такі рэжысёр — Марцін Скарсэзэ. Чула?

(Так, я ведаю, ведаю, ведаю я!)

— І нават глядзела. Можа, нешта з французскай, італьянскай кінашколы, а то ўсё ЗША...

— Люк Бесон.

— О-о. А з рускага кіно?

— Я не гляджу рускае кіно, — з грэблівай усмешкай вымавіў ён.

Пытацца пра беларускае я не стала.

Для працягу тэмы аб кінаманах і псеўда-, я адправілася чытаць форумы і рэцэнзіі на сайтах. Цікава, якія каментары пакідаюць кінааматары на сусветнае і беларускае кіно. Можа, яны і не называюць сябе словам, якое неяк абавязвае, але думку сваю лічаць аўтарытэтнай. Зразумець гэта можна па тым, што яны знаходзяць час для выказванняў накшталт:

«Глядзець можна» — ну, дзякуй Богу. «Я чакаў большага» — чаго ж ты такі наіўны? «Увогуле нядрэнна», «нармальна», «пойдзе» — схіляю галаву за адзнаку. «Шкада патрачанага часу» — і садзіцца паўтараць англійскую мову ці чытаць Блеза Паскаля. «Бярэ за душу» — ацэнка кожнага трэцяга каментатара. «Гэта класіка» — тут усё сказана. «Фільм не для сярэдняга розуму» — і ўсе моўчкі пайшлі глядзець «Амерыканскі пірог». «На адзін раз» — значыць, не шэдэўр, не шэ-дэ-ўр (працяжна).

Кадр з фільма «У тумане» Сяргея ЛАЗНІЦЫ.

Вельмі часта фільм аказваецца: «нуднаватым» (у параўнанні з чым?), «незразумелым» (Таркоўскага ж глядзіш!), «зацягнутым» (так-так, трэба спяшацца чытаць Паскаля/рамантаваць кран, а тут гэты фільм), але і «афігенным» (усё, што змаглі з прыдыханнем выказаць у культурным экстазе), уражлівым, узрушальным (а што ўразіла, што ўзрушыла, што, што, што?).

Яшчэ кінакарціна можа аказацца «несусветнай каламутай», «цягамоцінай», «лухтой», і сцеражыцеся больш моцных слоўцаў.

Каментарыі-канстатацыі, раскіданыя тут і там, складваюцца ў чытача ў пэўную характарыстыку, накшталт «глядзець/не глядзець». Магу запэўніць: каментарыі часта не адлюстроўваюць рэальнай каштоўнасці фільма. І калі не лічыце сябе чалавекам «сярэдняга розуму», то «глядзець можна».

Ёсць і больш шматслоўныя карыстальнікі сайтаў і ўдзельнікі форумаў. Такія звычайна падмацоўваюць сваю станоўчую/адмоўную ацэнку тлумачэннем, у пэўным сэнсе аналізам і кароткім водгукам.

Сярод інтэрнэт-кінаманаў, назавём іх так, сустракаюцца:

ТЫЯ, ХТО ГЛЯДЗІЦЬ У ПЕРСПЕКТЫВЕ

«Фільм можа мець права на жыццё», — каментуе глядач руска-беларускую карціну «Нерэальнае каханне». Здымачная група ўздыхнула з палёгкай.

«Фільм з пункту гледжання маляўнічасці і рэжысуры зняты вельмі ўражліва, але не надзённы і наўрад ці ўсхвалюе сучаснага гледача». Але ж ці быў хоць адзін глядач, якога не ўсхваляваў фільм «Апошняе танга ў Парыжы» Бернарда Берталучы?..

ТЫЯ, ХТО АБДЗЕЛЕНЫ РЭЖЫСЁРСКАЙ УВАГАЙ

«Гэта не мастацтва, гэта здыхаючае жаданне выказацца пра нешта сваё, што не мае аніякай каштоўнасці для іншага чалавека». Затое гэтым фільмам («Апошняе танга ў Парыжы») можна казырнуць і быць разумнай дзяўчынкай (хлопчыкам). А вы кажаце, ніякай каштоўнасці.

ПАРЫВІСТЫЯ

«Эмоцыі, пачуцці так і бурляць, так і кішаць». Хай абмінуць мяне эмоцыі, якія кішаць...

МАРАЛІСТЫ

«А тым «філосафам», якія шукаюць сэнс у гэтым фільме (а яны яго будуць шукаць у любой бязглуздзіцы) я б раіў пачытаць якую-небудзь разумную кнігу», — кажа ён пра фільм «Старым тут не месца» братоў Коэн і відавочна намякае на сіндром пошуку глыбіннага сэнсу, але ў яго кнігах гэта так не называюць. А яшчэ мараліст піша з памылкамі. А братоў Коэн глядзіце, калі ласка.

«Згодна, што часам хочацца паглядзець што-небудзь лёгкае, але ў гэтым фільме лёгкасць проста зашкальвае», — сказана пра «Нерэальнае каханне» зноў жа.

ТЫЯ, ХТО ЎСЁ ВЕДАЕ

«Ражэ Вадзім — класік французскага кіно (та-а-ак). Ён здымаў многіх «зорак», у тым ліку і Брыджыт Бардо (так-та-а-а-ак). Прыгожай жанчыне цяжка захоўваць рамкі прыстойнасці (ах, які пасаж!). І фільм пра гэта распавядае», — пра фільм «І Бог стварыў жанчыну» Ражэ Вадзіма. Збоку паглядзім на прыгожых жанчын.

ДЗІЎНЫЯ

«Глядзелі краем вока, здаўся вельмі невыразным», — пішуць пра фільм «Жанчыны на мяжы нервовага зрыву» Альмадовара. Было б дзіўна, калі б пасля прагляду краем вока здалося інакш.

«Увогуле адчуваецца недахоп фінансавых сродкаў...» — чытаю пра «Анастассю Слуцкую» Юрыя Елхава. Завуаляванае рацыянальнае зерне.

ПАДУЛАДНЫЯ СТЭРЭАТЫПАМ

«Рэдка гляджу айчынныя фільмы. Уключыла толькі дзеля цікаўнасці і адразу ж уцягнулася», — сказана пра расійска-беларускі фільм «З 8 Сакавіка, мужчыны!».

Пра «Фотапавелічэнне» Антаніёні: «Што ж рабіць, глядзець ці не? Апісанне інтрыгуе. Але год! (1966)... Цікава, тады былі добрыя фільмы?». Бяда...

Пра «Сібірскага цырульніка» Міхалкова: «Трапіў на фільм з-за таго, што адразу пачаў чытаць каментарыі і не паглядзеў на краіну...». А сала рускае ядуць, як казаў бацька Крылоў!

АБАВЯЗКОВЫЯ

Аб карціне «Жанчыны на мяжы нервовага зрыву»: «Фільм мне не спадабаўся, Альмадовара не люблю, не мая эстэтыка, паглядзеў толькі з-за Бандэраса». Але каментарый пакінуў.

КАМПЕТЭНТНЫЯ

«Фільм трохі нацягнуты да сярэдзіны, але пачатак даволі захапляльны. Многія сцэны не пазбаўлены сэнсу, але, відавочна, лішнія», — пра карціну «Хірасіма, мая любоў». Відавочна лішнія сцэны... І гэта ў Алена Рэнэ.

«Фільм занадта сур'ёзны. Можна было б зрабіць яго больш дынамічным, каб было цікавей глядзець». Уявіце карціну «У тумане» Лазніцы дынамічнай...

БЕЗ НАЗВЫ

Пра фільм «Дзіця» братоў Дардэн: «Фільм не вельмі, акцёр — як бомж». Так трэба, дзяўчынка.

Пра «Ролю» Лапушанскага: «Чаму ён чорна-белы? Замуцілі пад даўніну?». О, дзіця прагрэсу.

РЭЦЭНЗІІ, ЯК МАСТАЦКІЯ ТВОРЫ

«...Ёсць фільмы, якія нараджаюць жаданне, напрыклад, удыхнуць усімі грудзьмі водар восеньскай пунсовай ружы, пераносячыся ў думках у казачны свет з малочнымі рэкамі і шакаладнымі берагамі. Гэтая карціна пакінула мяне без пачуццяў...». Галоўная гераіня фільма «Піяністка» Міхаэля Ханэке таксама была бяздушнай.

НІКУДЫ БЕЗ АГРЭСІЎНЫХ

«Табе тата з мамай так канкрэтна мозг прамылі, што ты, дажыўшы да сівізны, прыгажосці Бардо не бачыш, а ўсё нейкае п'янае трызненне пішаш?»

А ВОСЬ ГЭТА ЦІКАВА:

Пра фільм «Дэкамерон» Пазаліні: «Як жа, як жа ... Памятаю, у дзяцінстве ўпотай ад мамы глядзелі, за што і былі бітыя неаднаразова...»

Пра «Люстэрка» Таркоўскага: «У тыя гады пайшоў на прагляд элітнага (элітнага!) кіно з адной знаёмай і заснуў дзесьці ў сярэдзіне... Прачынаюся ад гукаў яе рыдання: яна плакала, над маёй... нятонкасцю».

І хопіць, хопіць сядзець у інтэрнэце. Вернемся ў рэальнае жыццё.

Здаралася пасля сумеснага прагляду:

Прыніжальнае «Гэта не фільм!» на адрас карціны «Скура, у якой я жыву» Альмадовара. Не фільм — шэдэўр, напэўна, меркавалася сказаць.

«Я не ўбачыла галоўную гераіню як маці», — выказванне аб Вользе Мікалаеўне з «Рабы кахання» Міхалкова. Камень у агарод рэжысёра, кшталту: «Ты нас, маці, не паважаеш?».

І, НАРЭШЦЕ, МАЕ КАМЕНТАРЫ:

Упэўнена, са шкадаваннем і як бы ў фраку, цыліндры і з люлькай: «Вам не здаецца, што «Страх і нянавісць у Лас-Вегасе» нясе ў сабе пэўную рызыку для выхавання моладзі?». Павінен быць гамерычны смех у адказ.

«Труфо не патлумачыў у сваім фільме («Жуль і Джым»), чаму Катрын — фатальная жанчына». Чаму Ганна Гацье ў фільме «Мужчына і жанчына» — удава, чаму Вася Ходас у «Белых росах» мяккацелы, чаму Косця Пацехін у «Вясёлых хлопцах» спявае, чаму Рока з «Рока і яго браты» такі высакародны.

«Э-э-э...» — сказана мной пра стужку «У тумане» Лазніцы.

Давайце выпраўляцца.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

■